# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

1 лютага 2019 г. № 5 (490)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ




Фота БелТА.

# Дасягаем разам — працуем на будучыню

**ПЕРШЫ Нацыянальны форум па ўстойлівым развіцці прайшоў у сталіцы на мінулым тыдні. На ім прадстаўнікі бізнесу, грамадскасці, улады і міжнародных арганізацый абмеркавалі, як наша краіна будзе рухацца да дасягнення 17 Мэт устойлівага развіцця. Ужо прайшло тры гады, як МУР былі прынятыя. Прамежкавыя вынікі для нашай краіны падводзілі на чатырох сесіях — гэта блокі, прысвечаныя эканоміцы, экалогіі, сацыяльным пытанням і сістэме маніторынгу разам з ацэнкай імплементацыі Мэт.**




**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** адзначыў падчас адкрыцця форуму, што гэты год асаблівы. «Рэспубліканскімі і мясцовымі органамі кіравання, прадпрыемствамі трэба будзе забяспечыць рэалізацыю задач, сфармуляваных ва ўказе Прэзідэнта Беларусі аб сацыяльна-эканамічным развіцці ў 2019 годзе, і прыступіць да распрацоўкі праекта асноўных напрамкаў развіцця Беларусі да 2025 года. Задача няпростая: у 2025 годзе выйсці на аб'ём ВУП у 100 мільярдаў долараў ЗША ў эквіваленце», — растлумачыў спікер. Ён заўважыў, што МУР — арганічная састаўная частка сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Міхаіл Мясніковіч спадзяецца, што нацыянальны кангрэс будзе актыўны і, улічваючы дасягнутыя вынікі работы па МУР, выпрацуе прапановы па росце эканомікі Беларусі і ўзроўні жыцця яе грамадзян на перспектыву. «Задача ў нас агульная — павышэнне якасці жыцця насельніцтва на аснове росту канкурэнтаздольнасці эканомікі і інавацыйнага развіцця», — рэзюмаваў ён.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** нагадаў, што наша краіна прымала актыўны ўдзел у распрацоўцы Парадку-2030.




«Па сутнасці, менавіта прыярытэты ўстойлівага развіцця вызначаюць унутраную і знешнюю палітыку Беларусі. Гэта заканамерна, бо ў аснове МУР блізкая і зразумелая нашаму народу ідэя сацыяльнай справядлівасці, якая першапачаткова закладзена ў аснову беларускай дзяржаўнасці», — тлумачыць спікер ніжняй палаты парламента. Уладзімір Андрэйчанка адзначыў патэнцыял нашай эканомікі і ўмацаваны аўтарытэт Беларусі ў сусветнай супольнасці. «Ва ўлады ёсць дакладная стратэгія і напрацаваныя механізмы пераадолення крызісных з'яў. Але галоўнае — у нас якасна змянілася свядомасць людзей. Наяўнасць грамадзянскага міру, адсутнасць канфліктаў на нацыянальнай і канфесійнай глебе — гэта найважнейшыя паказчыкі кансалідацыі грамадства, узрослага ўзроўню яго прававой, эканамічнай і палітычнай культуры. І сёння гэта наш ключавы рэсурс устойлівага развіцця», — лічыць спікер.

Па словах парламентарыя, каб Беларусь і далей працягвала дынамічна развівацца, вельмі важна захаваць згуртаванасць нацыі і давер народа да ўлады. «Забеспячэнне дабрабыту краіны — гэта перш за ўсё справа самой краіны і яе грамадзян. Таму прынцып сацыяльнай справядлівасці азначае для нас адначасова і сацыяльную салідарнасць. Кожны павінен унесці свой пасільны ўклад у агульную справу», — падвёў вынікі Уладзімір Андрэйчанка.

стар. 3

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### «Зялёная» чацвёрка



Якая дзейнасць у галіне экалогіі павінна стаць прыярытэтнай? стар. 4

### Маладзейшымі не становімся...



Каля 15 % насельніцтва — старэйшыя за 65 гадоў. Што чакае далей? стар. 13

### Інфраструктура развіваецца



Новая школа адкрыецца 1 верасня ў маладым гродзенскім мікрараёне Альшанка. стар. 15

### Шанц на працу



На Валожыншчыне больш за тысячу чалавек уключаны ў спісы не занятых у эканоміцы. стар. 16

### Ізноў «Горка!»



У Клецку плануюць узнавіць старадаўнія вясельныя строі. стар. 16